АПОСТАЛЬСКІ ЛІСТ
**SCRIPTURAE SACRAE AFFECTUS**

СВЯТОГА АЙЦА
ФРАНЦІШКА

у тысяча шасцісотую гадавіну смерці св. Гераніма

*Замілаванне да Святога Пісання*, жывая і глыбокая любоў да запісанага Божага слова – гэта спадчына, якую пакінуў Касцёлу св. Геранім праз сваё жыццё і творы. Словы, узятыя з яго літургічнага ўспаміну [1], даюць нам, пасля шаснаццаці стагоддзяў з дня яго смерці, патрэбны ключ для разумення яго выдатнай постаці ў гісторыі Касцёла і яго вялікай любові да Хрыста. Гэтая любоў разліваецца як рака на мноства ручаёў у яго нястомнай працы як вучонага, перакладчыка, экзегета, глыбокага знаўцы і гарачага папулярызатара Святога Пісання; выдатнага інтэрпрэтатара біблійных тэкстаў; гарачага і часам нястрыманага абаронцы хрысціянскай праўды; аскетычнага і бескампраміснага пустэльніка, а таксама дасведчанага духоўнага кіраўніка ў сваёй велікадушнасці і пяшчоце. Сёння, праз 1600 гадоў, яго постаць застаецца вельмі важнай для нас, хрысціянаў XXI стагоддзя.

*Уступ*

Геранім завяршыў сваё зямное жыццё 30 верасня 420 г. у Бэтлееме ў супольнасці, якую сам заснаваў пры гроце Нараджэння Хрыста. Такім чынам, ён даверыў сябе таму Пану, якога заўсёды шукаў і распазнаваў у Святым Пісанні; таму, каго, як Суддзю, ён ужо сустрэў, будучы ў ліхаманцы, у адной візіі, магчыма ў перыяд Вялікага посту 375 году. Гэтая падзея стала пераломным момантам у яго жыцці, нагодай для навяртання і змены перспектывы. Ён адчуў, што стаіць перад Суддзёю, пра што ўспамінаў: «Адказваючы на пытанне аб сваім стане, я адказаў, што я хрысціянін. Але той, хто сядзеў спераду, сказаў: „Хлусіш! Ты цыцэронец, а не хрысціянін”». [2] Сапраўды, св. Геранім з дзіцячых гадоў любіў чыстую прыгажосць класічных лацінскіх тэкстаў, у параўнанні з якімі біблійныя творы спачатку

падаліся яму грубымі і некарэктнымі, занадта рэзкімі для яго вытанчанага літаратурнага густу.

Гэты эпізод з яго жыцця паўплываў на яго рашэнне цалкам прысвяціць сябе Хрысту і Ягонаму слову, аддаючы сваё жыццё таму, каб праз сваю нястомную працу як перакладчыка і каментатара зрабіць боскія пісанні больш даступнымі для іншых. Гэтая падзея надала ягонаму жыццю новую і больш пэўную мэнакіраванасць: стаць слугою Божага слова, закаханым у «цела Пісання». Так у няспынных пошуках, якімі вызначалася яго жыццё, ён дасканаліць сваю юнацкую адукацыю і фармацыю, атрыманую ў Рыме, накіроўваючы ў іншае рычышча свае веды дзеля больш сур'ёзнага служэння Богу і касцёльнай супольнасці.

Так св. Геранім стаў адной з выдатных постацяў старажытнага Касцёла ў перыяд, вядомы як залаты век патрыстыкі; сапраўдным мастам паміж Усходам і Захадам: з юнацтва сябруе з Руфінам Аквілійскім, сустракаецца з Амброзіем і вядзе частую перапіску з Аўгустынам. На Усходзе знаёміцца з Грыгорыем Назіянзскім, Дыдымам Александрыйскім, Эпіфаніем Саламінскім. Хрысціянская іканаграфічная традыцыя прадстаўляе яго як святога разам з Аўгустынам, Амброзіем і Грыгорыем Вялікім, сярод гэтых чатырох вялікіх дактароў Заходняга Касцёла.

У розных абставінах мае папярэднікі ўжо ўзгадвалі св. Гераніма. Сто год таму, на пятнаццатае стагоддзе з дня яго смерці, Бэнэдыкт XV прысвяціў Гераніму сваю энцыкліку *Spiritus Paraclitus* (15 верасня 1920 г.), прадставіўшы яго свету як «*doctor maximus explanandis Scripturis*». [3] У апошні час Бэнэдыкт XVI прысвяціў яго асобе і творчасці дзве чарговыя катэхезы. [4] Цяпер, у 1600-ю гадавіну яго смерці, я таксама жадаю ўшанаваць памяць св. Гераніма і яшчэ раз падкрэсліць актуальнасць яго паслання і навучання, пачынаючы з яго вялікага замілавання да Святога Пісання.

У пэўным сэнсе яго можна прадставіць у дасканалым спалучэнні як надзейнага праваднікa і прывілеяванага сведку ўслед за XII Сходам Сіноду Біскупаў, які быў прысвечаны Божаму слову, [5] а таксама разам з Апостальскай адгартацыяй *Verbum Domini* (*VD*) майго папярэдніка Бэнэдыкта XVI, апублікаванай ва ўспамін святога, 30 верасня 2010 года. [6]

*З Рыма ў Бэтлеем*

Жыццё і асабісты шлях св. Гераніма ідуць дарогамі Рымскай імперыі, паміж Еўропай і Усходам. Ён нарадзіўся каля 345 г. у Стрыдоне, на памежжы Паноніі і Далмацыі, на тэрыторыі сучаснай Харватыі або Славеніі. Атрымаў грунтоўнае выхаванне ў хрысціянскай сям'і. Як было прынята ў тыя часы, ён быў ахрышчаны ў дарослым узросце, будучы студэнтам рыторыкі ў Рыме, паміж 358 і 364 гадамі. Менавіта ў гэты час ён стаў ненасытным чытачом лацінскай класікі, які вучыўся пад кіраўніцтвам самых выдатных на той час настаўнікаў рыторыкі.

Пасля вучобы ён здзейсніў доўгае падарожжа па Галіі, якое прывяло яго ў імперскі горад Трэвір, які сёння знаходзіцца ў Германіі. Менавіта там ён упершыню сутыкнуўся з усходнім манаствам, якое пашыраў св. Атаназій. Так сталее яго глыбокае жаданне, якое не пакідае яго ў Аквілеі, дзе разам з некалькімі сваімі сябрамі ён ініцыюе «хор благаслаўлёных», [7] перыяд супольнага жыцця.

Каля 374 года, праходзячы праз Антыёхію, ён вырашае сысці ў пустыню Халкіс, каб больш радыкальна весці аскетычнае жыццё, у якім шмат месца адводзіць вывучэнню біблійных моў, спачатку грэцкай, а затым габрэйскай. Ён даяраецца аднаму брату габрэю, які прыняў хрысціянства і дапамог яму пазнаць новую, габрэйскую мову і яе гукі, якія, па яго словах, былі «шыпячымі і прыдыхальнымі». [8]

Геранім выбірае пустыню, а пазней жыццё на пустыні, у самым глыбокім яе значэнні: як месца асноўных экзістэнцыяльных выбараў, блізкасці і сустрэчы з Богам, дзе праз сузіранне, унутраныя выпрабаванні і духоўную барацьбу ён пачынае глыбей разумець сваю слабасць, больш усведамляючы абмежаванасць сваю і іншых людзей і прызнаючы значэнне слёз. [9] Такім чынам на пустыні ён адчуў канкрэтную прысутнасць Бога, неабходнасць адносінаў чалавека з Ім, Яго міласэрнае суцяшэнне. У гэтым кантэксце мне ўспамінаецца анекдот з апакрыфічнай традыцыі. Геранім пытаецца ў Пана: «Што хочаш ад мяне?» − І Ён адказвае: «Ты не ўсё яшчэ аддаў мне». − «Але ж, Пане, я даў табе гэта, гэта і гэта». − «Не хапае адной рэчы». − «Якой?» − «Дай мне свае грахі, каб я мог атрымаць радасць іх прабачэння яшчэ раз». [10]

Пасля мы знаходзім Гераніма ў Антыёхіі, дзе ён быў пасвячаны ў святары біскупам гэтага горада Паўлінам, а затым, прыблізна ў 379 г., у Канстанцінопалі, дзе ён знаёміцца з Грыгорыем Назіянзскім і працягвае вучобу, перакладае з грэцкай мовы на лацінскую важныя творы (гаміліі Арыгена і хроніку Эўзэбія), удыхае атмасферу Сабору, які адбываўся ў гэтым горадзе ў 381 годзе. У гэтыя гады навучання выявілася яго захапленне і шчодрасць. Гэта благаслаўлёны неспакой, які вядзе яго і робіць нястомным і поўным запалу ў сваіх пошуках: «Колькі разоў я расчароўваўся; колькі разоў я адмаўляўся, але потым дзякуючы ўпартаму жаданню вучыцца распачынаў зноў», ідучы праз «горкае насенне» такой вучобы да збірання «салодкіх пладоў». [11]

У 382 г. Геранім вярнуўся ў Рым і трапіў у распараджэнне папы Дамаса, які, ацаніўшы яго выдатныя якасці, зрабіў яго сваім блізкім супрацоўнікам. Тут Геранім вядзе актыўную дзейнасць, не забываючы аднак пра духоўнае вымярэнне. На Авентыне пры падтрымцы рымскіх арыстакратак, такіх як Марцэла, Паўла і яе дачка Эўстахія, якія імкнуцца да евангельскага радыкалізму, ён стварае кола, прысвечанае чытанню і дакладнаму вывучэнню Святога Пісання. Геранім выступае як экзегет, настаўнік і духоўны кіраўнік. У гэты час ён пераглядае ранейшыя лацінскія пераклады Евангелля і, магчыма, іншых частак Новага Запавету; працягвае працу перакладчыка гамілій і біблійных каментарыяў Арыгена;

займаецца надзвычай актыўнай эпісталярнай дзейнасцю; вядзе публічныя спрэчкі з аўтарамі-ерэтыкамі, часам дапускаючы празмернасць і нястрыманасць, але заўсёды маючы шчырае жаданне бараніць праўдзівую веру і дэпазіт Святога Пісання.

Гэты напружаны і плённы перыяд быў перарваны смерцю папы Дамаса. Геранім вымушаны пакінуць Рым і ў таварыстве сяброў і некаторых жанчын, якія пайшлі за ім, жадаючы працягнуць распачаты ім досвед духоўнага жыцця і вывучэння Бібліі, адпраўляецца спачатку ў Егіпет, дзе сустракае вялікага тэолага Дыдыма Александрыйскага, а затым у Палестыну, каб канчаткова ў 386 г. пасяліцца ў Бэтлееме. Ён зноў бярэцца за вывучэнне філалогіі, будучы звязаным з канкрэтнымі месцамі, якія згадваюцца ў біблійных апавяданнях.

Важнасць, якую ён прыпісваў святым мясцінам, бачна не толькі ў яго рашэнні жыць у Палестыне, з 386 г. да самай смерці, але і ў падтрымцы пілігрымак. Менавіта ў Бэтлееме, яго прывілеяваным месцы, паблізу грота Нараджэння Пана ён засноўвае два кляштары «двайняты», мужчынскі і жаночы, прытулкі для пілігрымаў, якія прыбываюць у святыя месцы (*ad loca sancta*), паказваючы гэтым сваю велікадушнасць у прыняцці тых, хто прыязджае на гэтую зямлю, каб убачыць і дакрануцца да месцаў гісторыі збаўлення, спалучаючы такім чынам культурныя і духоўныя пошукі. [12]

Услухоўваючыся ў Святое Пісанне, Геранім знаходзіць самога сябе, аблічча Бога і сваіх братоў, а таксама пацвярджае сваю прыхільнасць да супольнага жыцця. Адсюль яго жаданне жыць з сябрамі, як у Аквілеі, засноўваць манаскія супольнасці для рэалізацыі цэнабіцкага ідэалу манаскага жыцця, дзе кляштар разглядаецца як «трэнажорны зал», у якім выхоўваюцца людзі, «якія былі меншыя за ўсіх, каб яны маглі стаць першымі сярод усіх», шчаслівымі ў беднасці і здольнымі вучыць іншых сваім стылем жыцця. Ён лічыць, што жыццё «пад кіраўніцтвам аднаго айца і ў таварыстве многіх» мае выхаваўчае значэнне, бо вучыць пакоры, цярплівасці, маўчанню і лагоднасці, разуменню таго, што «праўда не любіць цёмных куткоў і не шукае шэптаў». [13] Ён таксама прызнаецца, што «сумуе па келлях кляштара, [...] жадае наследаваць руплівасць тых мурашак, дзе ўсе працуюць разам і дзе няма нічога, што б належала толькі камусьці, але ўсё належыць усім». [14]

Геранім не шукае ў вучобе часова задавальнення і самамэты, але лічыць яе як бы духоўным практыкаваннем і сродкам набліжэння да Бога. Таму яго класічнае выхаванне таксама было падпарадкавана больш глыбокаму служэнню касцёльнай супольнасці. Давайце паразважаем пра дапамогу, якую ён аказаў папу Дамасу, пра яго навучанне жанчын, асабліва па-габрэйску, з часоў першага кола на Авентыне, у выніку чаго Паўла і Эўстахія ўвайшлі ў «змаганні перакладчыкаў» [15]і мелі магчымасць чытаць і спяваць псальмы на мове арыгінала, што было чымсьці нечуваным у тыя часы. [16]

Культура, якой ён вызначаўся, была прызначана для служэння і з’яўляецца неабходнай для

кожнага евангелізатара. Ён так нагадвае свайму сябру Непацыяну: «Слова прэзбітэра павінна зыходзіць з чытання Святога Пісання. Я не хачу, каб ты быў дэкламатарам, крыклівым пустазвонам, але тым, хто разумее таямніцу (*mysterii*) і глыбока ведае Боскія сакрамэнты (*sacramentorum*). Выклікаць захапленне ў нявопытнага натоўпу патокам словаў і хуткай гаворкай уласціва невукам. Бессаромны чалавек часта тлумачыць тое, чаго сам не ведае, і прыкідваецца вялікім экспертам толькі таму, што яму ўдаецца пераканаць іншых». [17]

У Бэтлееме, аж да сваёй смерці ў 420 г., Геранім перажывае самы плённы і напружаны перыяд свайго жыцця, цалкам прысвечаны вывучэнню Святога Пісання і манументальнай працы па перакладзе ўсяго Старога Запавету з габрэйскага арыгінала. У той жа час ён каментуе кнігі прарокаў, псальмы, творы Паўла, а таксама піша дапаможнікі па вывучэнні Бібліі. Каштоўная праца, замацаваная ў яго творах, з’яўляецца плёнам канфрантацыі і супрацоўніцтва, ад перапісвання і супастаўлення рукапісаў да разважанняў і дыскусій: «Я ніколі не давяраў уласным сілам, вывучаючы Божыя тамы, [...] у мяне ёсць звычка пытацца нават пра тое, што я, як мне здавалася, ведаў, а тым больш пра тое, у чым я не быў упэўнены». [18] Вось чаму, усведамляючы сваю абмежаванасць, ён просіць пастаяннай падтрымкі ў заступніцкай малітве аб паспяховасці свайго перакладу святых тэкстаў «у тым самым Духу, у якім яны былі напісаны», [19] не забываючы таксама пра пераклад твораў аўтараў, неабходных для экзэгетычнай працы, такіх як Арыген, каб «даць матэрыял тым, хто хоча дасягнуць поспеху ў веданні рэчаў». [20]

Даследаванне Гераніма разглядаецца як намаганне, рэалізаванае ў межах супольнасці і дзеля служэння супольнасці, як мадэль сінадальнасці для нас, для нашага часу і для розных культурных інстытуцый Касцёла, каб яны заўсёды былі «месцамі, дзе веды становяцца служэннем, бо без ведаў, якія нараджаюцца ў выніку супрацоўніцтва і вядуць да ўзаемадзеяння, няма ніякага сапраўднага і інтэгральнага чалавечага развіцця». [21] Фундаментам такой еднасці з’яўляецца Святое Пісанне, якое мы не можам чытаць адныя: «Біблія напісана Божым народам і для Божага народу пад натхненнем Духа Святога. Толькі ў гэтай еднасці з Божым народам можам сапраўды дайсці з нашым „мы” да сутнасці праўды, якую Бог хоча нам перадаць». [22]

Трывалы жыццёвы досвед, узгадаваны Божым словам, дазволіў Гераніму дзякуючы шырокай карэспандэнцыі стаць духоўным правадыром. Ён спадарожнічаў многім, бо быў перакананы, што «без настаўніка нельга навучыцца ніякаму майстэрству», як пісаў Рустыку: «Гэта ўсё хачу табе прывіць, трымаючы цябе за руку, падобна як дасведчаны мараплавец пасля многіх караблекрушэнняў спрабуе навучыць недасведчанага марака». [23] Са свайго спакойнага кутка свету ён сачыў за чалавецтвам у эпоху вялікіх хваляванняў, пазначаных такімі падзеямі, як рабаванне Рыма ў 410 годзе, якое моцна закранула яго.

У сваіх лістах ён вядзе дактрынальныя спрэчкі, абараняючы заўсёды праўдзівую веру,

будучы чалавекам моцных і далікатных адносінаў, шчырага аддання, без саладжавасці, бо «любоў бясцэнная». [24] Ён перажывае свае пачуцці жыва і шчыра. Такая рэакцыя на сітуацыі, у якіх ён жыве і працуе, выяўляецца таксама ў тым, што ён прапануе сваю працу перакладчыка і каментатара як *munus amicitiae* [сяброўскую паслугу]. Гэта ў першую чаргу дар для сяброў, да якіх ён кіруе і якім прысвячае свае творы, якіх просіць, каб яны чыталі іх прыязным, а не крытычным вокам, а пасля чытачам, яго сучаснікам і людзям усіх часоў. [25]

Апошнія гады жыцця ён праводзіць у асабістым і супольным малітоўным чытанні Святога Пісання, у сузіранні, у служэнні братам сваімі творамі. Усё гэта ён робіць у Бэтлееме, ля грота, у якім Дзева нарадзіла Слова, ведаючы, што «шчаслівы той, хто ў сваёй душы носіць крыж, уваскрасенне, месца нараджэння Хрыста і месца Яго ўнебаўшэсця! Шчаслівы той, хто ў сваім сэрцы мае Бэтлеем і ў чыім сэрцы штодня нараджаецца Хрыстус!». [26]

*Сапенцыяльны ключ да яго вобраза*

Для поўнага разумення асобы св. Гераніма трэба спалучыць два вымярэнні, якія характарызавалі яго жыццё як веруючага чалавека: з аднаго боку абсалютная і рыгарыстычная адданасць Богу, з адмаўленнем ад любога людскога задавальнення дзеля любові да ўкрыжаванага Хрыста (пар. *1 Кар* 2, 2; *Флп* 3, 8.10); з другога боку, руплівыя намаганні ў вучобе, скіраванай выключна на больш поўнае разуменне таямніцы Пана. І менавіта гэтае падвойнае сведчанне, якое цудоўна дае Геранім, прапанавана як узор: перадусім для манахаў, каб тых, хто жыве аскезай і малітвай, заахвоціць да цяжкой даследчыцкай і інтэлектуальнай працы; затым для вучоных, якія павінны памятаць, што веды маюць рэлігійную каштоўнасць толькі тады, калі грунтуюцца на выключнай любові да Бога, калі пазбаўлены ўсякіх людскіх амбіцый і свецкіх памкненняў.

Гэтыя вымярэнні знайшлі адлюстраванне ў гісторыі мастацтва, дзе часта прадстаўляецца св. Геранім: вялікія майстры заходняга мастацтва пакінулі нам яго выявы. Мы можам вылучыць іканаграфічныя жанры паводле двух розных спосабаў яго прадстаўлення. Адзін паказвае яго перадусім як манаха і пакутніка, са знясіленым ад посту целам, які ўкрываецца ў пустыні, кленчыць або ляжыць крыжам на зямлі, часта з заціснутым у правай руцэ каменем, каб біць сябе ў грудзі, і з вачыма, скіраванымі да Укрыжаванага. У гэтую лінію ўпісваецца кранальны шэдэўр Леанарда да Вінчы, які захоўваецца ў Ватыканскай Пінакатэцы. Другі спосаб прадстаўлення Гераніма – той, які паказвае яго ў вопратцы вучонага, які сядзіць за сваім сталом, каб перакладаць і каментаваць Святое Пісанне, у атачэнні кніг і пергаментаў, зануранае думкамі і пісаннем у місію абароны веры. У такой паставе, – прыводзячы іншы славуты прыклад, – прадстаўляе яго неаднаразова Альбрэхт Дзюрэр.

Згаданыя вышэй два аспекты можна ўбачыць разам на палатне Караваджо ў Галерэі Баргезэ ў Рыме. У адной сцэне прадстаўлены стары аскет, нядбайна ахінуты ў чырвоную

тканіну, які трымае на стале чэрап, сімвал марнасці зямных спраў, і адначасова моцна паказаны таксама характар вучонага, вочы якога глядзяць у кнігу, а яго рука макае пяро ў чарніліцу ў характэрным для пісьменніка жэсце.

Падобным чынам – які я назваў бы сапенцыяльным – мы павінны разумець падвайны характар жыццёвай дарогі Гераніма. Калі ён як сапраўдны «бэтлеемскі леў» быў празмерны ў тоне сваіх выказванняў, то рабіў гэта дзеля пошуку праўды, бескампрамісным слугою якой быў гатовы стаць. І як сам гэта тлумачыць у адным з першых сваіх лістоў пад назваю *Жыццярыс св. Паўла Тэбанскага, пустэльніка*, львы здольныя і на «магутны рык», і на слёзы. [27] Таму тое, што з’яўляецца ў яго вобразе як бы дзьвюма супрацьлеглымі рысамі, пасутнасці гэта элементы, пры дапамозе якіх Дух Святы дазваляе яму гартаваць духоўную еднасць.

*Любоў да Святога Пісання*

Адметнай рысай духоўнасці св. Гераніма была, несумненна, яго гарачая любоў да Божага слова, даручанага Касцёлу ў Святым Пісанні. Усе дактары Касцёла, − асабліва з першых стагоддзяў хрысціянства, − выразна чэрпалі змест свайго навучання з Бібліі, але Геранім рабіў гэта больш сістэматычна і ў нейкай ступені непаўторна.

У апошні час экзегеты адкрылі нарацыйную і паэтычную геніяльнасць Бібліі менавіта з увагі на яе выразнасць. Геранім жа падкрэсліваў у Святым Пісанні больш ціхмяны характар аб’яўлення Бога, паказаны з дапамогаю грубай і амаль прымітыўнай прыроды габрэйскай мовы ў параўнанні з вытанчанасцю лаціны Цыцэрона. Таму ён прысвяціў сябе Святому Пісанню не з эстэтычных меркаванняў, але − як добра вядома − толькі таму, што Святое Пісанне вяло яго да пазнання Хрыста, бо няведанне Святога Пісання − гэта няведанне Хрыста. [28]

Геранім вучыць нас, што трэба вывучаць не толькі Евангеллі, і трэба каментаваць не толькі апостальскую традыцыю, заключаную ў Дзеях Апосталаў і ў Пасланнях, бо для разумення праўды і багацця Хрыста неабходны ўвесь Стары Запавет. [29] Нават старонкі самога Евангелля сведчаць пра гэта: яны гавораць нам пра Езуса як пра Настаўніка, які звяртаецца да Майсея, прарокаў і Псальмаў (пар. Лк 4, 16-21; 24, 27.44-47), каб растлумачыць сваю таямніцу. Прапаведаванне Пятра і Паўла ў Дзеях Апосталаў таксама ў большасці караніцца ў Пісаннях Старога Запавету; без іх нельга ў поўнай меры зразумець постаць Божага Сына, Месіі Збаўцы. Стары Запавет нельга разглядаць толькі як шырокі спіс цытат, якія пацвярджаюць спаўненне прароцтваў у асобе Езуса з Назарэта. Хутчэй, кажучы больш радыкальна, толькі ў святле старазапаветных «фігур» можна зразумець паўнату значэння падзеі Хрыста, якая здзейснілася ў Яго смерці і ўваскрасенні. Таму трэба нанава адкрыць ў катэхетычнай і казнадзейскай практыцы, а таксама ў тэалагічных трактатах неад’емны ўклад Старога Запавету, які трэба чытаць і засвойваць як каштоўную ежу (пар. Эзх 3, 1-11; Ап 10,

8-11). [30]

Поўная адданасць Гераніма Святому Пісанню выяўляецца ў форме яго гарачых выказванняў, падобна старажытным прарокам. Менавіта ад іх наш Доктар чэрпае ўнутраны агонь, які становіцца палымяным і рэзкім словам (пар. *Ер* 5, 14; 20, 9; 23, 29; *Мал* 3, 2; *Сір* 48, 1; *Мц* 3, 11; *Лк* 12, 49), неабходным для выражэння гарачай руплівасці таго, хто служыць Божай справе. Як у выпадку з Іллёю, Янам Хрысціцелем і апосталам Паўлам, абурэнне хлуснёй, крывадушнасцю і фальшывым вучэннем распальвае прамову Гераніма, робячы яе правакацыйнай і, здавалася б, жорсткай. Палемічнае вымярэнне яго твораў можна зразумець лепш, калі чытаць іх як своеасаблівае запазычанне і актуалізацыю самай сапраўднай прароцкай традыцыі. Таму Геранім з’яўляецца ўзорам бескампраміснага сведкі праўды, які выкарыстоўвае жорсткасць дакору, каб прывесці да навяртання. Праз інтэнсіўнасць выразаў і вобразаў выяўляецца мужнасць слугі, які хоча падабацца не іншым, але толькі свайму Пану (пар. *Гал* 1, 10), дзеля якога ён спажыў усю духоўную энергію.

*Даследаванне Святога Пісання*

Гарачая любоў св. Гераніма да Святога Пісання прасякнута паслухмянасцю. Перадусім Богу, які выразіў сябе словамі, якія патрабуюць слухання, поўнага пашаны, [31] а ў выніку паслухмянасці тым, хто ў Касцёле прадстаўляе жывую традыцыю інтэрпрэтацыі аб’яўленага паслання. Аднак «паслухмянасць веры» (*Рым* 1, 5; 16, 26) не з’яўляецца проста пасіўным прыняццем чагосьці ўжо вядомага; наадварот, патрабуе актыўных намаганняў у асабістым пошуку. Мы можам разглядаць св. Гераніма як вернага і працавітага «слугу» Слова, цалкам адданага пашырэнню сярод сваіх братоў і сясцёр у веры больш адэкватнага разумення даверанага ім святога «дэпазіту» (пар. *1 Цім* 6, 20; *2 Цім* 1, 14). Без разумення напісанага натхнёнымі аўтарамі само Божае слова пазбаўлена сваёй плённасці (пар. *Мц* 13, 19), і з яго не можа выплываць любоў да Бога.

Аднак біблійныя старонкі не заўсёды даступныя адразу. Як кажа Ісая (29, 11), нават для тых, хто ўмее «чытаць», гэта значыць для тых, хто прайшоў дастатковую інтэлектуальную падрыхтоўку, Святая Кніга падаецца «запячатанай», герметычна закрытай для інтэрпрэтацыі. Таму неабходна, каб умяшаўся кампетэнтны сведка і даў выратавальны ключ, Хрыста Пана, адзінага, хто можа зламаць пячатку і адкрыць кнігу (пар. *Ап* 5, 1-10) дзеля цудоўнага праліцця ласкі (пар. *Лк* 4, 17-21). Многія, нават сярод практыкуючых хрысціянаў, адкрыта кажуць, што не ўмеюць чытаць (пар. *Іс* 29, 12), не з прычыны непісьменнасці, але таму, што не падрыхтаваныя да разумення біблійнай мовы, спосабаў яе выражэння і старажытных культурных традыцый. У выніку чаго біблійны тэкст становіцца неразборлівым, нібы напісаным незнаёмым алфавітам і незразумелай мовай.

Таму неабходна пасрэдніцтва інтэрпрэтатара, які б мог выконваць сваю «дыяканскую» функцыю, служачы тым, хто не можа зразумець сэнс напісанага прароча. У сувязі з гэтым

можна ўзгадаць вобраз дыякана Філіпа, якога Пан падштурхнуў наблізіцца да еўнуха, які чытаў урывак з Ісаі (53, 7-8) на сваёй калясніцы, але не меў магчымасці зразумець яго сэнс. «Ці разумееш, што чытаеш?» − спытаў Філіп, а еўнух адказаў: «Як жа магу разумець, калі ніхто не павучыў мяне?» (*Дз* 8, 30-31). [32]

Геранім наш правадыр, бо як Філіп (пар. *Дз* 8, 35), ён вядзе кожнага чытача да таямніцы Езуса, а таксама таму, што адказна і сістэматычна дае экзегетычную і культурную інфармацыю, неабходную для правільнага і плённага чытання Святога Пісання. [33] Кампетэнтнасць у мовах, на якіх было перададзена Божае слова, дбайны аналіз і ацэнка рукапісаў, сістэматычныя археалагічныя даследаванні, а таксама веданне гісторыі інтэрпрэтацыі – адным словам усе метадалагічныя рэсурсы, якія былі даступныя ў яго гістарычную эпоху, ён умела і мудра выкарыстаў для таго, каб паказаць правільнае разуменне натхнёнага Пісання.

Гэты выдатны аспект дзейнасці св. Гераніма таксама мае вялікае значэнне для Касцёла ў наш час. Калі, як вучыць нас *Dei Verbum*, Біблія з'яўляецца «як бы душой святой тэалогіі» [34] і нібы духоўным касцяком хрысціянскай рэлігійнай практыкі, [35] то неабходна, каб інтэрпрэтацыя Бібліі была падмацавана канкрэтнымі навыкамі.

Безумоўна, гэтай мэце служаць такія спецыялізаваныя цэнтры біблійных даследаванняў, як Папскі біблійны інстытут у Рыме, École Biblique і Studium Biblicum Franciscanum у Ерузалеме, а для патрыстычных даследаванняў Augustinianum у Рыме. Аднак кожны тэалагічны факультэт павінен імкнуцца да таго, каб выкладанне Святога Пісання было запраграмавана так, каб студэнты атрымлівалі кампетэнтныя навыкі інтэрпрэтацыі, як у экзегезе тэкстаў, так і ў біблійнай тэалогіі ў цэлым. На жаль, багацце Святога Пісання многія не ведаюць ці мінімізуюць, таму што яны не атрымалі асноўных ведаў. Таму, акрамя павелічэння касцёльных праграм навучання для святароў і катэхетаў, якія б лепш выкарыстоўвалі веды ў галіне разумення Святога Пісання, варта таксама пашыраць фармацыю ўсіх хрысціянаў, каб кожны з іх мог адкрыць святую кнігу і чэрпаць з яе бясцэнныя плады мудрасці, надзеі і жыцця. [36]

Тут я хацеў бы прыгадаць тое, што мой папярэднік выказаў у Апостальскай адгартацыі *Verbum Domini*: «Сакрамэнтальнасць слова становіцца зразумелай праз аналогію з сапраўднай прысутнасцю Хрыста ў кансэкраваных постацях хлеба і віна. [...] Наконт таго, як трэба адносіцца да Эўхарыстыі і да Божага слова, св. Геранім піша: „Мы чытаем Святое Пісанне. Думаю, што Евангелле – гэта цела Хрыста; думаю, што Святое Пісанне – гэта Яго вучэнне. А калі Ён гаворыць: ‘Калі не будзеце спажываць Цела Сына Чалавечага і піць Крыві Ягонай’ (*Ян* 6, 53), то хоць гэтыя словы можна разумець у аднясенні да [эўхарыстычнай] таямніцы, не менш аднак цела Хрыста і Яго Кроў сапраўды з'яўляюцца словам Пісання, Божым вучэннем”». [37]

На жаль, у многіх хрысціянскіх сем’ях ніхто не адчувае сябе здольным − як было прадпісана ў Торы (пар. *Дрг* 6, 6) - перадаваць сваім дзецям слова Пана ва ўсёй яго прыгажосці, з усёй яго духоўнай сілай. Таму я ўстанавіў нядзелю Божага слова, [38] каб заахвоціць да малітоўнага чытання Бібліі і знаёмства з Божым словам. [39] Любое іншае праяўленне пабожнасці набудзе дзякуючы гэтаму больш багаты сэнс, зойме сваё месца ў іерархіі каштоўнасцяў і будзе весці да таго, што з’яўляецца вяршыняй веры: да поўнага з’яднання з таямніцай Хрыста.

*Вульгата*

«Салодкім плёнам карпатлівай сяўбы» [40] вывучэння Геранімам грэцкай і габрэйскай моваў, стаў пераклад Старога Запавету на лацінскую мову з габрэйскага арыгінала. Да гэтага часу хрысціяне Рымскай імперыі маглі чытаць Біблію цалкам толькі на грэцкай мове. У той час як кнігі Новага Запавету былі напісаны на грэцкай мове, кнігі Старога Запавету існавалі ў поўнай версіі перакладу, гэтак званай *Сэптуагінце* (г.зн. версіі сямідзесяці), зробленай габрэйскай супольнасцю Александрыі прыблізна ў II ст. да нар. Хрыста. Але для чытачоў, якія карысталіся лацінскай мовай, не было поўнай версіі Бібліі на іх мове, толькі некалькі частковых і няпоўных перакладаў з грэцкай мовы. Заслуга Гераніма і тых, хто працягваў яго працу, заключалася ў пераглядзе і ў новым перакладзе ўсяго Святога Пісання. Пасля перагляду Евангелляў і Псалтыра ў Рыме па заахвочванні папы Дамаса Геранім распачаў у сваім адасабленні ў Бэтлееме пераклад усіх старазапаветных кніг непасрэдна з габрэйскай мовы: працу, якая доўжылася гадамі.

Для выканання гэтай перакладчыцкай працы Геранім добра выкарыстаў свае веды грэцкай і габрэйскай моваў, сваю салідную лацінскую адукацыю, а таксама філалагічныя інструменты, якія меў у распараджэнні, у прыватнасці *Гекзаплю* Арыгена. Канчатковы тэкст аб’яднаў у сабе працяг формул, якія ўжо шырока ўвайшлі ва ўжытак, з большай вернасцю габрэйскаму арыгіналу, не адыходзячы ад элегантнасці лацінскай мовы. У выніку ўзнік сапраўдны помнік, які азнаменаваў культурную гісторыю Захаду, фарміруючы яго тэалагічную мову. Перамогшы некаторае першапачатковае непрыняцце, пераклад Гераніма адразу стаў агульнай спадчынай як навукоўцаў, так і звычайных вернікаў; адсюль яго назва Вульгата. [41] Сярэднявечная Еўропа навучылася чытаць, маліцца і разважаць са старонак Бібліі ў перакладзе Гераніма. Такім чынам «Святое Пісанне стала своеасаблівым „велізарным слоўнікам” (Поль Кладэль) і „іканаграфічным атласам” (Марк Шагал), з якога чэрпала хрысціянская культура і мастацтва». [42] Літаратура, мастацтва і нават размоўная мова няспынна чэрпалі з Геранімавай версіі Бібліі, пакідаючы нам скарбы прыгажосці і пабожнасці.

Менавіта дзякуючы гэтаму бясспрэчнаму факту Трыдэнцкі Сабор у дэкрэце *Insuper* сцвердзіў «аўтэнтычны» характар Вульгаты, аддаўшы даніну яе выкарыстанню ў Касцёле на працягу многіх стагоддзяў і пацвердзіўшы яе каштоўнасць як інструмента для

даследавання, пропаведзі і публічных спрэчак. [43] Аднак гэта не змяншала значэння арыгінальных моў, бо Геранім не толькі не забараняў рабіць у будучыні новыя захады для поўнага перакладу, але таксама няспынна нагадваў пра іх. Святы Павел VI па прапанове Айцоў Другога Ватыканскага Сабору пажадаў, каб праца па пераглядзе перакладу Вульгаты была завершана і прадстаўлена ўсяму Касцёлу. Так у 1979 г. Ян Павел II у Апостальскай канстытуцыі *Scripturarum thesaurus*[44] абнародаваў узорнае выданне, якое называецца «Новая Вульгата» (лац. Nova Vulgata).

*Пераклад як інкультурацыя*

Сваім перакладам Гераніму ўдалося здзейсніць «інкультурацыю» Бібліі ў лацінскую мову і культуру, а яго праца стала трывалым узорам місійнай дзейнасці Касцёла. Сапраўды, «калі нейкая супольнасць прымае пасланне збаўлення, Дух Святы напаўняе яе культуру перамяняючай моцаю Евангелля», [45] і такім чынам узнікае своеасаблівае замкнёнае кола: гэтак жа, як пераклад Гераніма абавязаны мове і культуры лацінскіх класікаў, уплыў якіх выразна бачны, так і яго пераклад са сваёй мовай і сваім сімвалічным зместам і ўяўленнем стаў у сваю чаргу творчым элементам культуры.

Перакладчыцкая праца Гераніма вучыць нас, што каштоўнасці і пазітыўныя формы кожнай культуры ўзбагачаюць увесь Касцёл. Розныя спосабы абвяшчэння, разумення і перажывання Божага слова ўзбагачаюць само Святое Пісанне, бо, паводле вядомага выказвання Грыгорыя Вялікага, яно ўзрастае разам з тым, хто яго чытае, [46] набываючы цягам стагоддзяў новыя акцэнты і новае гучанне. Уключэнне Бібліі і Евангелля ў розныя культуры робіць Касцёл усё больш відавочнай «абранніцай, упрыгожанай сваімі каштоўнасцямі» (Іс 61, 10). У той жа час гэта сведчыць аб тым, што Біблію неабходна пастаянна перакладаць на мову і менталітэт кожнай культуры і кожнага пакалення, а таксама на секулярызаваную глабальную культуру нашага часу. [47]

Слушна было адзначана, што можна правесці аналогію паміж перакладам як актам «моўнай адкрытасці» і іншымі відамі гасціннасці. [48] Вось чаму пераклад не з’яўляецца працай, якая датычыць толькі мовы, але па-сутнасці адлюстроўвае больш шырокае этычнае рашэнне, звязанае з цэласным бачаннем жыцця. Без перакладу розныя моўныя супольнасці не змаглі б мець зносін паміж сабой; мы зачынілі б дзверы гісторыі адзін перад адным і адмовілі б у магчымасці будаваць культуру сустрэчы. [49] Сапраўды, без перакладу няма гасціннасці, а варожасць наадварот узрастае. Перакладчык − гэта будаўнік мастоў. Колькі паспешных рашэнняў, колькі асуджэнняў і канфліктаў узнікае з-за таго, што мы не разумеем мовы іншых людзей і не бяромся з цвёрдай надзеяй за бясконцае выпрабаванне любові, якім з’яўляецца пераклад!

Гераніму таксама давялося супрацьстаяць пануючай думцы свайго часу. Калі веданне грэцкай мовы было адносна распаўсюджаным на світанні Рымскай імперыі, то ў яго час гэта

стала ўжо рэдкасцю. Аднак ён стаў адным з найлепшых знаўцаў грэцкай мовы і хрысціянскай грэцкай літаратуры. Пачаўшы вывучаць габрэйскую мову, ён здзейсніў яшчэ больш цяжкае і самотнае падарожжа. Калі, як ужо было напісана, «межы маёй мовы вызначаюць межы майго свету», [50] то можам сказаць, што за больш універсальнае разуменне хрысціянства і ў той жа час больш звязаным з яго крыніцамі, мы абавязаны шматмоўю св. Гераніма.

Разам з цэлебрацыяй чарговай гадавіны смерці св. Гераніма наш погляд скіраваны на незвычайную місійную жыццяздольнасць, якая выяўляецца ў перакладзе Божага слова больш чым на тры тысячы моў. Многім місіянерам мы абавязаны за неацэнную справу выдання граматык, слоўнікаў ды іншых лінгвістычных дапаможнікаў, якія ствараюць аснову для камунікацыі людзей і з'яўляюцца носьбітамі «місійнай мары дасягнуць усіх». [51] Трэба ацаніць усю гэтую працу і інвеставаць у яе, дапамагаючы пераадолець межы некамунікатыўнасці і адсутнасці сустрэчы. Шмат яшчэ трэба зрабіць. Як было ўжо сказана, без перакладу не можа быць разумення: [52] мы не зразумелі б ні сябе, ні іншых.

*Геранім і пасад Пятра*

Геранім заўсёды меў асаблівыя адносіны з Рымам: Рым быў духоўным прыстанішчам, да якога ён пастаянна вяртаўся; у Рыме ён атрымаў гуманітарную адукацыю і сфарміраваўся як хрысціянін; ён быў *homo romanus*. Гэтая сувязь вельмі адмыслова адлюстоўваецца ў мове гэтага Горада, лаціне, майстрам і знаўцам якой ён быў, але перадусім яна звязана з Рымскім Касцёлам, асабліва з пасадам Пятра. Іканаграфічная традыцыя анахранічна прадстаўляе яго ў кардынальскім пурпуры, каб паказаць яго прыналежнасць да прэзбітэрату Рыма поруч з папам Дамасам. Менавіта ў Рыме быў распачаты перагляд перакладу. І нават калі зайздрасць і непаразуменні прымусілі яго пакінуць горад, ён заўсёды захоўваў моцную сувязь з пасадам Пятра.

Для Гераніма Рымскі Касцёл з'яўляецца ўрадлівай глебай, на якой зерне Хрыста прыносіць багаты плён. [53] У неспакойны час, калі непадзельную туніку Касцёла часта раздзіралі падзелы паміж хрысціянамі, Геранім глядзеў на пасад Пятра як на надзейны арыенцір: «Як я не іду ні за кім, акрамя Хрыста, так я не маю зносін ні з кім, акрамя Вашай Святасці, гэта значыць з пасадам Пятра. Бо ведаю, што на гэтай скале пабудаваны Касцёл». У разгар спрэчак з арыянамі ён напісаў Дамасу: «Той, хто не збірае з табою, раскідвае; хто не ад Хрыста, той ад антыхрыста». [54] Такім чынам, ён мог бы таксама сказаць: «Я з тым, хто яднаецца з пасадам Пятра». [55]

Геранім часта ўдзельнічаў у вострых спрэчках за веру. Любоў да праўды і гарачая абарона Хрыста прывялі яго, магчыма, да празмернай слоўнай парывістасці ў лістах і творах. І ўсё ж ён імкнуўся да міру: «Я таксама жадаю міру, і не толькі жадаю яго, а прашу аб ім! Але я маю на ўвазе мір Хрыстовы, сапраўдны мір, мір без варожасці, мір, які не мае ў сабе ўкрытай

вайны, мір, які не падпарадкоўвае сабе праціўнікаў, але яднае іх як сяброў».[56]

Сёння нашаму свету як ніколі патрэбны лекі міласэрнасці і еднасці. Дазвольце мне яшчэ раз паўтарыць: давайма прыцягальнае і прывабнае сведчанне братэрскай еднасці. [57] «Па гэтым усе пазнаюць, што вы Мае вучні, калі будзеце мець любоў адзін да аднаго» (*Ян* 13, 35). Вось аб чым Езус прасіў Айца ў кранальнай малітве: «каб усе былі адно [...], каб паверыў свет» (*Ян* 17, 21).

*Палюбіць тое, што любіў Геранім*

У завяршэнне гэтага ліста я хачу звярнуцца да ўсіх з заклікам. Сярод шматлікіх пахвал, якія гучаць у адрас св. Гераніма ад нашчадкаў, ёсць адна, што быў ён не проста адным з найвялікшых вучоных гэтай «бібліятэкі», якой сілкуецца ўвесь час хрысціянства, пачынаючы са скарбніцы Святога Пісання, але пра яго можна сказаць тое, што ён сам сказаў пра Непацыяна: «Праз пастаяннае чытанне і доўгае разважанне ён зрабіў сваё сэрца бібліятэкай Хрыста». [58] Геранім не шкадаваў сілаў для пашырэння сваёй бібліятэкі, якую заўсёды разглядаў як неабходную майстэрню для разумення веры і духоўнага жыцця; у гэтым таксама ён служыць выдатным прыкладам для цяперашняга часу. Але на гэтым ён не спыніўся. Для яго вучоба не абмяжоўвалася юнацкімі гадамі яго выхавання; яна была пастаянным абавязацельствам, штодзённым прыярытэтам яго жыцця. Можна сказаць, што ён засвоіў усю бібліятэку і стаў распарадчыкам ведаў для многіх іншых. Пастуміян, які ў IV ст. падарожнічаў па Усходзе, даследуючы манаскія рухі, на свае вочы ўбачыўшы стыль жыцця Гераніма, з якім правёў некалькі месяцаў, пісаў: «Ён заўсёды заняты чытаннем, заўсёды ў сваіх кнігах; ён не адпачывае ні днём, ні ноччу; пастаянна або штосьці чытае, або піша». [59]

У сувязі з гэтым я часта думаю пра досвед, які малады чалавек можа атрымаць сёння, заходзячы ў кнігарню ў сваім горадзе ці наведваючы Інтэрнэт-сайт, шукаючы рэлігійныя кнігі. У большасці выпадкаў гэты раздзел, калі ён існуе, не толькі маргінальны, але дрэнна забяспечаны матэрыяламі. Гледзячы на гэтыя паліцы ці вэб-старонкі, маладому чалавеку цяжка зразумець, што рэлігійныя пошукі могуць стаць захапляльнай прыгодай, якая лучыць сэрца і розум; што прага Бога распальвае вялікія розумы на працягу стагоддзяў аж да цяперашняга часу; што рост духоўнага жыцця ўплываў на тэолагаў і філосафаў, мастакоў і паэтаў, гісторыкаў і навукоўцаў. Адна з праблемаў, з якімі мы сёння сутыкаемся, не толькі ў рэлігіі, − гэта непісьменнасць: нам не хапае герменеўтычных навыкаў, якія б зрабілі нас надзейнымі перакладчыкамі нашай уласнай культурнай традыцыі. Асабліва я хацеў бы звярнуцца да моладзі: пачніце даследаваць сваю спадчыну. Хрысціянства робіць вас спадкаемцамі непараўнальнай культурнай спадчыны, уладальнікам якой вы павінны стаць. Будзьце ў захапленні ад гэтай вашай гісторыі. Майце адвагу скіраваць свой позірк на таго

неспакойнага юнака Гераніма, які, як герой прыпавесці Езуса, прадаў усё, што меў, каб набыць «каштоўную пярліну» (*Мц* 13, 46).

Сапраўды, Гераніма можна назваць «бібліятэкай Хрыста», невычарпальнай бібліятэкай, якая праз шаснаццаць стагоддзяў працягвае вучыць нас таму, што азначае любоў Хрыста, любоў, якая непадзельна звязана з сустрэчай з Яго словам. Вось чаму цяперашнюю гадавіну можна разглядаць як заклік палюбіць тое, што любіў Геранім, нанова адкрыць яго творы і дазволіць захапіць сябе духоўнасцю, якую можна ахарактарызаваць па сутнасці як неспакойнае і гарачае жаданне больш пазнаваць Бога Аб'яўлення. Як жа нам не паслухаць у наш час тое, да чаго няспынна заклікаў сваіх сучаснікаў Геранім: «Пастаянна чытай Божае Пісанне; ніколі не выпускай святога тэксту са сваіх рук». [60]

Яркім прыкладам з'яўляецца Дзева Марыя, да якой звяртаўся Геранім, згадваючы перш за ўсё Яе Дзявочае Мацярынства, а таксама як узор малітоўнага чытання Святога Пісання. Марыя разважала ў сваім сэрцы (пар. *Лк* 2, 19. 51), «бо як святая чытала Святое Пісанне, ведала прарокаў і параўноўвала тое, што сказаў ёй анёл Габрыэль з тым, што прадказалі прарокі [...]. Яна глядзела на свайго нованароджанага Сына, свайго адзінага Сына, які ляжаў у яслях і плакаў, але бачыла, насамрэч, таго, хто быў Сынам Божым; яна параўноўвала ўбачанае з прачытаным і пачутым». [61] Даручым сябе той, якая лепш за ўсіх можа навучыць нас чытаць, разважаць, маліцца і сузіраць Бога, які нястомна робіць сябе прысутным у нашым жыцці.

*Дадзена ў Рыме, у св. Яна на Латэране, 30 верасня 2020 года, ва ўспамін св. Гераніма, у восьмы год майго Пантыфікату.*

*Францішак*

---

[1] *«Deus qui beato Hieronymo presbitero suavem et vivum Scripturae Sacrae affectum tribuisti, da, ut populus tuus verbo tuo uberius alatur et in eo fontem vitae inveniet»* (Collecta Missae Sanctae Hieronymi, *Missale Romanum*, editio typica tertia, Civitas Vaticana, 2002). Пераклад на бел. мову: «*Божа, Ты адарыў святога Гераніма жывою і глыбокаю любоўю да Святога Пісанння, умацуй нашыя сэрцы Тваім словам і дай нам знайсці ў ім жыватворную крыніцу*» (Калекта з літургічнага ўспаміну св. Гераніма, *Рымскі Імшал для дыяцэзій на Беларусі*, Мінск 2004).

[2]*Ep.* 22, 30: *CSEL* 54, 190.

[3]*AAS* 12 (1920), 385-423.

[4] Пар. *Audientiae Generales* 7 і 14 лістапада 2007: *Insegnamenti,*III, 2 (2007), 553-556; 586-591.

[5] Synodus Episcoporum, *Nuntius ad Populum Dei XII Coetus Generalis ordinarii*(24 кастрычніка 2008).

[6] Пар. *AAS*102 (2010), 681-787.

[7] *Chronicum*374: *PL*27, 697-698.

[8] *Ep*. 125, 12: *CSEL*56, 131.

[9] *Ep*. 122, 3: *CSEL* 56, 63.

[10] Пар. *Meditatio matutina,* 10 снежня 2015. Анекдот цытуецца з: A. Louf, *Sotto la guida dello Spirito*, Qiqaion, Magnano (BI) 1990, 154-155.

[11] Пар. *Ep*. 125, 12: *CSEL*56, 131.

[12] Пар. *VD,* 89.

[13] Пар. *Ep*. 125, 9.15.19: *CSEL* 56, 128.133-134.139.

[14] *Vita Malchi monachi captivi* 7, 3: *PL* 23, 59-60; *Opere storiche e agiografiche,*a cura di B. Degórski, *Opere di Girolamo,*XV, Città Nuova, Roma 2014, 196-199.

[15] *Praef. Esther*2: *PL*28, 1505.

[16] Пар. *Ep*. 108, 26: *CSEL*55, 344-345.

[17] *Ep*. 52,8: *CSEL*54, 428-429; пар. *VD,* 60.

[18] *Praef. Paralipomenon LXX*, 1. 10-15: *SCh*592, 340.

[19] *Praef. in Pentateuchum*: *PL*28, 184.

[20] *Ep*. 80, 3: *CSEL*55, 105.

[21] *Nuntius occasione data XXIV sollemnis Sessionis publicae Pontificiarum Academiarum,* 4 снежня 2019: *L'Osservatore Romano*, 6 снежня 2019, p. 8.

[22] *VD,* 30.

[23] *Ep*. 125, 15.2: *CSEL* 56, 133.120.

[24] *Ep*. 3, 6: *CSEL*54, 18.

[25] Пар. *Praef. Iosue*, 1, 9-12: *SCh* 592, 316.

[26] *Homilia in Psalmum XCV*: *PL* 26, 1181; пар. S. Girolamo, *59 Omelie sui Salmi (1-115)*, a cura di A. Capone, *Opere di Girolamo*, IX/1, Città Nuova, Roma 2018, 357.

[27] Пар. *Vita S. Pauli primi eremitae*, 16, 2: *PL* 23, 28; *Opere storiche e agiografiche,* op. cit., p., 111.

[28] Пар. S. Hieronimus, *In Isaiam Prol*.: *PL*24, 17, цыт. за: Дагматычная канстытуцыя пра Божае Аб'яўленне *Dei Verbum,* у: Дакументы Другога Ватыканскага Сабору, Мінск 2008, с. 276.

[29] Пар. Другі Ватыканскі Сабор, Дагм. канст. *Dei Verbum*, 14.

[30] Пар. *тамсама*.

[31] Пар. *тамсама*, 7.

[32] *Ep. 53, 5*: *CSEL* 54, 451; S. Girolamo, *Le lettere*, a cura di S. Cola, II, Città Nuova, Roma 1997, 54.

[33] Пар. Дакументы Другога Ватыканскага Сабору, Дагм. канст. *Dei Verbum*, 12.

[34] *Тамсама*, 24.

[35] Пар. *тамсама*, 25.

[36] Пар. *тамсама*, 21.

[37] N. 56; пар. *In Psalmum CXLVII*: *CCL* 78, 337-338; S. Girolamo, *59 Omelie sui Salmi (119-149)*, a cura di A. Capone, *Opere di Girolamo,*IX/2, Città Nuova, Roma 2018, p. 171.

[38] Пар. Апостальскі ліст у форме motu proprio *Aperuit illis* (30 верасня 2019).

[39] Пар. Апост. адгарт. *Evangelii gaudium*, 152. 175.

[40] Пар. *Ep*. 52, 3: *CSEL*54, 417.

[41] Пар. *VD*, 72.

[42] Ioannes Paulus II, *Epistula ad artis cultores* (4 красавіка 1999), 5: *AAS*91 (1999), 1159-1160.

[43] Пар. Denzinger-Schönmetzer, *Enchiridion Symbolorum*, 1506.

[44] 25 красавіка 1979: *AAS* LXXI (1979), 557-559.

[45] Апост. адгарт. *Evangelii gaudium*, 116.

[46] *Hom. in Ezech*. I, 7: *PL*76, 843D.

[47] Пар. Апост. адгарт. *Evangelii gaudium*, 116.

[48] Пар. P. Ricoeur, *Sur la Traduction*, Bayard, Paris 2004.

[49] Пар. Апост. адгарт. *Evangelii gaudium*, 24.

[50] L. Wittgenstein, *Tractatus logico-philosophicus*, 5.6.

[51] Апост. адгарт. *Evangelii gaudium*, 31.

[52] Пар. G. Steiner, *After Babel. Aspects of Language and Translation*, Oxford University Press, New York 1975.

[53] Пар. *Ep*. 15, 1: *CSEL* 54, 63.

[54] *Тамсама*, 15, 2: *CSEL*54, 62-64.

[55] *Тамсама*, 16, 2: *CSEL*54, 69.

[56] *Тамсама*, 82, 2: *CSEL* 55, 109.

[57] Пар. Апост. адгарт. *Evangelii gaudium*, 99.

[58] *Ep*. 60, 10: *CSEL*54, 561.

[59] Sulpicius Severus, *Dialogus* I, 9, 5: *SCh*510, 136-138.

[60] *Ep.* 52, 7: *CSEL* 54, 426.

[61] *Homilia de nativitate Domini* IV: *PL Suppl.* 2,191.

Copyright © Dicastero per la Comunicazione - Libreria Editrice Vaticana